# ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 8(283) 1 — 8 сакавіка 2003 г.




**БЕЛОРУССКИЕ ВОПРОСЫ**

## Все дороги ведут в Третий Рим

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

**Накануне визита в Москву президента Лукашенко, в Вене Парламентская ассамблея ОБСЕ уравняла в правах официальную белорусскую депутацию с делегациями Канады, США и европейских стран. Отныне лукашенковские палатники вместе с российскими думцами станут полноправно организовывать безопасность и сотрудничество в Европе. Хотя вполне возможно, что через несколько лет опять возникнет вопрос, кого и какую страну представляют на венских сессиях белорусские парламентарии.**

20 февраля 2003 года 20 голосами «за», при 18 «против» и 5 «воздержавшихся», ПА ОБСЕ возобновила статус лукашенковских депутатов. Воздавая должное усердию российских думцев, неустанно ратовавших на венских сессиях за белорусских союзников, стоит отметить усилия французских и немецких парламентариев.

Не будь столь весомы французские и немецкие голоса, ПА ОБСЕ опять бы повременила с решением белорусского вопроса. Но теперь малые страны, вроде Бельгии, Дании, Голландии и прочих, проголосовавших за режим президента Лукашенко, вознамерились следовать в кильватере международной политики региональных сверхдержав.

Если Франция и Германия решили во всем пикироваться с США, значит, надо пускать в Европу всех антиамериканских субъектов. Тем более антиамериканизм белорусских властей бесспорен и очевиден. Так же, как не подлежит сомнениям и твердая позиция США по отношению к авторитаризму Александра Лукашенко.

Не было никаких внутрибелорусских причин, для того чтобы пускать в ПА ОБСЕ полпредов президента Лукашенко. Не считать же таковой открытие офиса ОБСЕ в Минске? Тогда как белорусский авторитаризм ничуть не смягчился. И демократии в Беларуси не прибавилось ни на йоту по сравнению с 1997 годом, когда ПА ОБСЕ поразила в правах свежеиспеченных представителей Александра Лукашенко.

Лиха беда начало. Вскоре следует ждать серьезной попытки реанимировать гостевой статус белорусской депутации в Парламентской ассамблее Совета Европы. Пусть Франции и Германии придется там очень непросто, доказывая, что лукашенковский авторитаризм отвечает демократическим и правозащитным критериям этой международной организации.

Хотя очень маловероятно, что лукашенковские гости будут заседать в ПАСЕ, но и без того решение парламентариев ОБСЕ ставит под сомнение 6 лет европейской политики на белорусском направлении. Оказывается, напрасно городили весь этот европейский огород после того, как в ноябре 1996 года в Беларуси произошел государственный переворот.

Можно, конечно, утешать себя тем, что генетическая линия ОБСЕ ведет свое происхождение от Заключительного акта 1975 года, призванного наводить хельсинкские гуманитарные мосты между несовместимыми системами правления. Но едва ли стоит уравнивать во внешнеполитических правах брежневскую СССР и лукашенковскую РБ. И спокойно ждать, пока белорусский режим сам собой трансформируется, подобно своему советскому предшественнику.

Не возбраняется также посетовать на врожденное уродство ОБСЕ и других международных институтов, сформированных в прошлом веке во времена «холодной войны» и мирного сосуществования с глобальной коммунистической угрозой. Те же наследственные болезни свойственны и ООН, и НАТО. Но эффективность последних несравнима с ОБСЕ.

Возобновив полномочия лукашенковских нацсобранцев, ОБСЕ расписалась в демократической импотенции не только по причинам филогенетическим. Если не удалось обуздать белорусский авторитаризм, то Беларусь вполне можно использовать в качестве разменной монеты в континентальной блокаде США.

Антимериканская антанта России, Франции и Германии дорогого стоит. В обмен на евролояльность Россия получает карт-бланш на любые действия на постсоветском пространстве. За исключением стран Балтии, уже практически интегрированных в систему континентальной солидарности, Франция и Германия де-факто соглашаются на гегемонию России на остальной территории бывшего СССР.

*Окончание на стр. 3*

**ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ**

## Зорныя войны-2

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

**У свой час кінаактор Рональд Рэйган стаўся аб'ектам для кпінаў журналістаў усяго свету, ягоную праграму супрацьракетнай абароны назаўсёды звязалі з назвай папулярнага кінабаевіка «Зорныя войны». Сёння касмічныя прыгоды сталіся неактуальнымі. Значна больш захапляюць гледача фільмы кшталту «Матрыцы», дзе барацьба са злом перанесеная ў віртуальныя прасторы і глабальныя сеткі. На мінулым тыдні свет даведаўся, што Буш-малодшы не здрадзіў лепшым традыцыям дзядулі Рэйгана. У нетрах Белага дома распрацоўваецца афіцыйная канцэпцыя кібернетычнай вайны.**

Паралеляў з рэйганаўскай падрыхтоўкай да зорных боек у ЗША пазбягаюць. І асацыююць «Дырэктыву 16» хутчэй з ядзернай дактрынай Трумэна сярэдзіны мінулага стагоддзя. Маўляў, па сваёй гістарычнай важкасці дакументы стаяць у адным шэрагу.

Варта зазначыць, што насамрэч «Дырэктыва 16» – больш дэкларатыўны дакумент, які закладае толькі асновы будучай канцэпцыі. Буш падпісаў сакрэтную паперку яшчэ ў жніўні мінулага года, але свет даведаўся пра яе існаванне толькі зараз – ад журналіста *Washington Post* Брэдлі Грэхэма.

Зліў інфармацыі ў разгар іракскага крызісу невыпадковы. На тле пацыфісцкай прапаганды Белы дом ідзе на выйгрышны крок, дэкларуючы сваю прыхільнасць да «*бяскроўнай вайны*». Масавай свядомасці прапануецца прыгожы вобраз баявых дзеянняў бліжэйшай будучыні: шэрагі салдатаў за

*Заканчэнне на стар. 4*

**ПРЯМАЯ РЕЧЬ**

## «Лукашизм не вечен»

**Павел Знавец — один из немногих известных оппозиционных политиков, кто принял решение баллотироваться на местных выборах. Сегодня Павел Знавец отвечает на вопросы нашего корреспондента Алеси Гординой.**

*– Павел, чем вы, будучи некогда депутатом Верховного совета, руководствовались, решив избираться в Минский городской совет депутатов?*

– Некоторые мне говорили, что горсовет – это низкий уровень, не стоит идти и мараться, результаты выборов все равно сфальсифицируют и сделают все, чтобы меня в депутаты не пропустить. Но другие настаивают, что надо участвовать, если есть хотя бы маленькая возможность что-то доказать людям, встретиться с ними и дать им надежду. И этим породить тот импульс, который, я надеюсь, в ближайшем будущем изменит в целом ситуацию на Беларуси в сторону демократизации. Вот этим я прежде всего руководствовался, а не соображениями, что местные выборы – это, дескать, мелко, и меня прокатят власти. И теперь, по прошествии агитационной кампании, я уверен, что большинство жителей Уручья меня поддержат.

Под лежачий камень вода не течет. Если ничего не делать, жизнь будет и дальше ухудшаться. Власть Лукашенко, как и его жизнь, не вечна. Я еще достаточно молод, но имею уже опыт депутатской деятельности в Верховном совете. И конкретно для Уручья и для Минска в целом кое-что смогу сделать. А в перспективе, ведь горсовет будет действовать до 2007 года (Лукашенко к тому времени, надеюсь, не будет), мы сможем реформировать местное самоуправление. И вернуть законодательный статус городской власти – горсовету, чтобы он полноценно функционировал. Независимые депутаты смогут сделать во сто крат больше, чем те, которые выдвигаются в горсовет от власти и полностью зависимы от нее. Имея депутатские мандаты, можно влиять на ситуацию и демократизировать ее.

*– Вряд ли в горсовет прорвется так уж много оппозиционеров, если допустить, что вообще кто-то попадет.*

– Если пройдут с десяток независимых кандидатов, они организуют демократическую фракцию, и ситуацию можно сдвинуть с мертвой точки. Есть опыт Сербии, где демократизация началась снизу, с местного самоуправления. Оппозиция сначала вошла в местные советы, а потом свергла и Милошевича, который казался вечным. Поэтому так на-

*Окончание на стр. 3*

## АНЕКДОТ-С

23 февраля – день защитников социалистического отечества. Оно уже 85 лет в опасности.

***

– Мне кажется, президенту Лукашенко не хватает патриотизма.

– Почему ты так решил?

– Даже когда выступает белорусская сборная, он болеет за какую-то малайскую команду. И все время кричит: «Малайцы! Малайцы!»

***

Хорошо быть трансвеститом. Ведь трансвеститам дарят цветы и 23 февраля, и 8 марта.

## ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



*«От права не свернуть влево»*

**(Р. Рудь, «Советская Белоруссия», 26.02.03)**



*«Положительно повлияло решение правительства об увеличении денежного довольствия военным профессионалам»*

**(генерал-майор А. Никитин, «Во славу Родины», 26.02.03)**



*«Жаркое лето агропромышленного комплекса уже началось»*

**(В. Баранов, «Рэспубліка», 26.02.03)**

## НАВІНЫ

**Мітынгі.** 24 лютага ў Віцебску прайшоў мітынг прадпрымальнікаў горада і вобласці, на якім прысутнічалі каля тысячы чалавек. На мітынгу была прынята рэзалюцыя з патрабаваннем адмяніць дэкрэты прэзідэнта нумар 3 і 4, якую прадпрымальнікі перадалі прадстаўнікам мясцовай выканаўчай улады. Удзельнікі мітынгу выказалі сваё *«абурэнне ўзмацненнем жорсткасці палітыкі дзяржавы ў галіне прадпрымальніцтва»*. 27 лютага ў мінскім парку Дружбы народаў адбудзецца санкцыянаваны Мінгарвыканкамам агульнарэспубліканскі мітынг прадстаўнікоў малога бізнесу.

**Мытня.** За мінулы тыдзень беларускія мытнікі выявілі 296 фактаў парушэння мытнага заканадаўства, па якіх канфіскавана тавараў і каштоўнасцяў на суму 5 мільярдаў 835 мільёнаў рублёў. З парушэннямі мытнага заканадаўства праз мяжу перавозіліся аўтатранспартныя сродкі, цыгарэты, алкагольная прадукцыя, валюта, абутак, абсталяванне і інструменты. З 17 па 23 лютага было канфіскавана 22,2 тысячы даляраў ЗША, 5,7 тысячы еўра, амаль 200 тысяч расійскіх рублёў, а таксама літоўскія літы, украінскія грыўны і іншая валюта на агульную суму звыш 70 мільёнаў рублёў.

**Галасаванне.** 25 лютага ў 10.00 пачалося датэрміновае галасаванне па выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў. На працягу пяці дзён, у адпаведнасці з Выбарчым кодэксам, 6 тысяч 388 выбарчых участкаў будуць працаваць з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін. Яшчэ ў суботу, 22 лютага, Цэнтрвыбаркам праверыў гатоўнасць участкаў да галасавання і ніякіх недахопаў не выявіў. Паводле звестак ЦВК, удзел у мясцовых выбарах змогуць узяць каля 7 мільёнаў выбаршчыкаў, у тым ліку і каля 70 тысяч расійскіх грамадзян, якія пастаянна жывуць у Беларусі. Ім давядзецца абраць 24 012 дэпутатаў у саветы ўсіх узроўняў. Асноўнае галасаванне адбудзецца 2 сакавіка.

**БНР.** Пасяджэнне «круглага стала» «Незалежная Беларусь яднае нас» з нагоды 85-й гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі прызначылі на 27 лютага ў Доме ўрада. Вядучыя мерапрыемства – дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік дэпутацкай групы «Рэспубліка» Уладзімір Парфяновіч і вядомы паэт Сяргей Законнікаў. Заяўленая мэта «круглага стала» – *«кансалідацыя палітычных, грамадскіх сілаў для годнага правядзення 85-й гадавіны ўтварэння БНР»*. У Дом урада запрасілі прадстаўнікоў усіх 18 зарэгістраваных у Міністэрстве юстыцыі партый, пяці міністэрстваў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, вядучых грамадскіх арганізацый Беларусі.

***GPRS.*** З 24 лютага ў сетцы аператара мабільнай сувязі СП ТАА «Мабільная лічбавая сувязь» *(Velcom)* уводзіцца новая паслуга *GPRS*. Яна дае абанентам *Velcom* магчымасць бесправоднага доступу да сеткі інтэрнет і *wap*-рэсурсаў у любы час і ў любым месцы дзеяння *GPRS*-сеткі *Velcom*. Новая паслуга прапаноўваецца абанентам *Velcom*, юрыдычным і фізічным асобам, падключаным па кантракце па тарыфных планах «Стандартны» і «Бізнес+», на ўсёй тэрыторыі дзеяння *GPRS*-сеткі *Velcom*. Актывацыя *GPRS* робіцца па пісьмовай заяве ў любым з 11 офісаў кампаніі па ўсёй Беларусі. У перыяд тэставай эксплуатацыі – з 24 лютага па 31 сакавіка 2003 года – паслуга *GPRS* бясплатная. Аб'ём трафіку для абанента пры карыстанні паслугай *GPRS* у перыяд тэставай эксплуатацыі не лімітаваны. Для атрымання доступу да сеткі інтэрнет з дапамогай паслугі *GPRS* абаненту *Velcom* неабходны мабільны тэлефон з падтрымкай *GPRS*, падключаны да кампутара (ноўтбука або прыстасавання тыпу *PDA, Pocket PC*). Для прагляду на экране свайго мабільнага тэлефона *wap*-сайтаў праз *GPRS* абаненту *Velcom* неабходны толькі мабільны тэлефон з падтрымкай *GPRS*.

**Палёты.** 27 лютага прэм'ер-міністр Генадзь Навіцкі накіруецца ў Маскву, дзе ў гэты ж дзень павінна адбыцца яго сустрэча са старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Міхаілам Касьянавым. 28 лютага Генадзь Навіцкі возьме ўдзел у пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці (ЕўразЭС).

**Сын.** Пасол Ірака Сальман Зейдан не пацвердзіў дату прыезду ў Беларусь старэйшага сына прэзідэнта Ірака Удэя Садама Хусэйна. 21 лютага ў СМІ была распаўсюджана інфармацыя аб тым, што Удэй, які з'яўляецца старшынёй Нацыянальнага алімпійскага камітэта Ірака, будзе прысутнічаць 29 сакавіка на штогадовым турніры па вольнай барацьбе на прызы Аляксандра Мядзведзя ў Мінску. Сальман Зейдан заявіў, што пасольства Ірака будзе ўсяляк садзейнічаць прыезду Удэя Садама Хусэйна. Але размову пра дакладную дату прыезду ў Беларусь старшыні НАК Ірака можна будзе весці толькі пасля афіцыйнага запрашэння НАК Беларусі, якое ў пасольства пакуль не накіравана.

**Эпідэмія.** На сёння аб эпідэміі грыпу афіцыйна аб'яўлена ў трох гарадах Беларусі: Мазыры – з 7 лютага, Віцебску – з 19 лютага і Оршы – з 20 лютага. У перыяд з 17 па 21 лютага ў лячэбна-прафілактычныя ўстановы 18 кантрольных гарадоў Беларусі з дыягназам «грып» і «вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя» (ВРВІ) звярнуліся 54 тысячы 719 чалавек. Гэты паказчык на 14,6 працэнта перавысіў захворванне за папярэдні тыдзень. Сярод хворых амаль 53 працэнты складаюць дзеці да 14 гадоў. У сярэднім па краіне эпідэмічны парог перавышаны ў 2,37 раза.

**СМІ.** Віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў не задаволены тым, як асвятляецца ў дзяржаўнай прэсе тэма аднаўлення сяброўства Нацыянальнага сходу ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Паводле слоў Канаплёва, нават расійскія выданні надалі гэтай падзеі больш увагі, чым беларускія. *«Наша паважаная «Народная газета» абмежавалася двума радкамі, у той час як расійскія «Известия» напісалі пра гэтую падзею 18 радкоў»*, – сказаў віцэ-спікер. Яшчэ больш жорсткую ацэнку даў Уладзімір Канаплёў працы БТ. *«Што тычыцца нашага беларускага паважанага тэлебачання, дык добра, што я яго не глядзеў. Яны вельмі лаканічныя. Яны сказалі роўна шэсць слоў за шэсць гадоў з 1997 года па гэты час, і я ім удзячны за такую вялікую падтрымку міжнароднай дзейнасці нашага парламента»*, – саркастычна заўважыў Канаплёў. Пры гэтым ён дадаў: *«Дзякуй Богу, што ў нас ёсць незалежная прэса»*.

## КАМПАНІЯ

# «Зробім лепш'03!»

**Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў (НДА) пачала падрыхтоўку да правядзення другой кампаніі «Зробім лепш!». Яна прымеркаваная да Сусветнага дня здароўя, які адзначаецца 7 красавіка.**




Першая кампанія пад такой назвай паспяхова прайшла ўлетку мінулага года ў 20 гарадах краіны і была прысвечаная добраўпарадкаванню тэрыторыяў. *«Наша спроба зрабіць лепшымі двары, пад'езды, пляжы, дзіцячыя пляцоўкі падвысіла вядомасць грамадскіх арганізацыяў і паказала простым людзям, што місія НДА – праца на карысць грамадства»*, – адзначыў старшыня экспертнай групы выканаўчага бюро асамблеі Вацлаў Арэшка.

Мерапрыемствы кампаніі «Зробім лепш» плануецца прысвяціць праблемам алкагалізму, здароўя маладых маці і рэпрадукцыйнаму здароўю нацыі наогул. Плануецца, што мерапрыемствы будуць вар'іравацца: ад правядзення навуковых канферэнцыяў, «круглых сталоў» і сацыялагічных апытанняў да ўпарадкавання стадыёнаў, спартовых пляцовак і акцыяў-падзякаў лекарам (*«Кветка лекару і медсястры»*). Грамадскія арганізацыі, што вырашылі ўзяць удзел у кампаніі, бліжэйшым часам дашлюць у Асамблею НДА свае прапановы і сцэнары мерапрыемстваў, што будуць ладзіць у сваіх рэгіёнах. ■

## ЮБІЛЕЙ

# Навінкі палітыкі

**У лютым газэта «Навінкі» адзначае 5 год з дня рэгістрацыі. За пяць год «Навінкі» сталі сапраўднай культурнай зьявай у беларускім недзяржаўным друку.**

Матэрыялы, якія прапануе чытачам газэта, часта правакацыйныя і разьлічаныя на наўмысны эпатаж прызвычаенага да шаблоннага мысьленьня спажыўца газэтнай інфармацыі, пакідаюць у стане непаразуменьня кожнага, хто ўпершыню сутыкаецца з газэтай, чыя назва наўпрост адсылае да знакамітага вар'яцкага шпіталю. Што ж такое газэта «Навінкі»? Апазыцыйная газэта, якая не пакідае ў спакоі ні саміх лідэраў апазыцыі, ні апазыцыю ўвогуле. Пародыя на газэту, якая прымушае чытача задумацца над легітымнасьцю ня толькі СМІ ва ўмовах рынкавага сацыялізму, але і ўвогуле над сэнсоўнасьцю існаваньня ў гэтым сьвеце. ■


НАВІНКІ

НАВІНКІ TV

Твор Туркменбашы – цяпер па-беларуску стар.2

Малевіч меў рацыю...

## 2 САКАВІКА

# Перадвыбарчыя дыспуты

ЯЗЭП ПАЛУБЯТКА, Масты

**Правядзенне дыспут-сустрэчаў на вёсцы і ў горадзе вельмі адрозніваецца. Можна папярэдне вызначыць тэму гутаркі, але прысутныя, у большасці сваёй людзі сталага і старога веку, цікавяцца выключна сваімі праблемамі і, навучаныя жыццём, пераводзяць гутарку ў гэта рэчышча.**

### ВЯСКОВЫЯ ГУТАРКІ

Зараз кандыдаты ў дэпутаты – і тыя, хто прытрымліваецца дэмакратычных поглядаў, і тыя, хто працуе ў структурах улады, але ўсюды падкрэслівае сваю беспартыйнасць, – ахвотна ўдзельнічаюць у дыспутах.

І калі першыя на дыспутах намагаюцца разабрацца ў звычайных праблемах вясковых людзей, то другія могуць паабяцаць знізіць падаткі, хоць дэпутаты гэтага рангу падобныя праблемы не могуць вырашыць, а з пенсіянера – якія падаткі?!

Якую зніжку падаткаў ты не абяцай людзям ці ўвогуле бі кулаком у грудзі і сцвярджай, што іх адменіш, вясковы чалавек ведае сваё: хто яму бульбу пасадзіць ці лазню напаліць? Вось з лазні варта і пачаць.

Дзве сустрэчы адбыліся на тэрыторыі Луненскага сельсавета. Адна з іх у вёсцы Падбараны, а другая ў самім мястэчку. На іх былі запрошаныя кандыдаты ў сельсавет і ў Гродзенскі абласны савет.

Апошні, Валеры Клімовіч, нарадзіўся на Мастоўшчыне, але зараз з'яўляецца адным з кіраўнікоў абласной прадзяржаўнай маладзёвай арганізацыі і ў выступах падкрэслівае сваю беспартыйнасць ды горача цвердзіць, што будзе ўсіх сваіх выбаршчыкаў забяспечваць працай і зніжаць падаткі.

Нечакана для кандыдатаў у дэпутаты і арганізатараў дыспута, гутарка ў Падбаранах у асноўным тычылася лазні. Лазня знаходзіцца ў больш-менш добрым стане, ёсць паліва, але яна не працуе. Былы лазнік памёр. І на працягу пэўнага часу не знаходзіцца чалавека, які б вырашыў займацца гэтай справай. Некалькі дзесяткаў прысутных не сталі слухаць гучных словаў пра дзяржаўныя інтарэсы, а рашуча запатрабавалі: зрабіце ўсё, каб лазня працавала, інакш не пойдзем на выбары. Звычайна вясковыя людзі глядзяць у рот заезжым лектарам, а тут рашуча абурыліся.

Другая праблема, паднятая падбаранцамі, – пасадка бульбы. Яны прапаноўвалі будучым кандыдатам абавязаць мясцовы саўгас правесці гэтую працу. У асноўным гаманілі пенсіянеры. Мясцовы саўгас мае свае праблемы, і таму кандыдат у абласны савет, які папярэдне быў на справаздачным сходзе ў гаспадарцы, прапанаваў, каб у гэтай справе бацькам дапамагалі дзеці, што жывуць у горадзе. Многія людзі з тым не пагадзіліся, і іх аргументам было тое, што яны ўсё жыццё адпрацавалі ў саўгасе за мізэрную зарплату, таму заслужылі пэўную дапамогу ад яго на старасці гадоў. Дэмакратычны кандыдат прапанаваў сумесна звярнуцца ў райаграпрамхарч, каб вырашыць праблему пасадкі бульбы для ўсіх пенсіянераў раёна.

Праблема пасадкі бульбы таксама адной з першых была паднята пад час дыспуту ў мястэчку, але канкрэтнага рашэння па ёй так і не было выпрацавана. Таксама важную праблему паднялі работнікі дзіцячага садка. Яна датычыла затрымкі выплаты заробкаў. Паколькі зараз у раёне паўсюдна назіраецца затрымка заробку ў бюджэтнікаў, то далей спачуванняў ад кандыдатаў у дэпутаты справа не пайшла.

### ПІЛЬНАЯ ЎВАГА ЎЛАДЫ

Пад час сустрэчы мяне не пакідала адчуванне, што ўлада і яе прадстаўнікі паталагічна баяцца чужынцаў: тых, хто без іх ведама і згоды вырашыў стаць дэпутатам хаця б мясцовага савета. І тым не менш мне было прыемна, што сюды прыйшлі кіраўнікі раённай маладзёвай арганізацыі БРСМ, пэўна, каб пераняць вопыт вядзення перадвыбарчай кампаніі ў дваццацігадовага дэмакрата, бо ўлада не знайшла сярод іх вартага, каб прапанаваць паўдзельнічаць у перадвыбарчай гонцы.

Алесь Зарэмбюк – самы малады кандыдат у раённыя дэпутаты ў Гродзенскай вобласці. Ён студэнт першага курса аддзяленне сацыялогіі гістарычнага факультэта Гродзенскага універсітэта. Але ён мае ўжо спецыяльнасць. Пасля заканчэння Гродзенскага каледжа мастацтваў Алесь атрымаў дыплом рэжысёра народных абрадаў і масавых відовішчаў.

Напачатку сярод людзей назіралаўся нейкі недавер да будучага кандыдата. Пасля рэгістрацыі каманда разам з кандыдатам зноў наведала амаль паўтысячы кватэраў. У гэты раз людзям былі зададзены канкрэтныя пытанні пра іх патрэбы, выслуханы іх пажаданні. Кандыдат у дэпутаты склаў не толькі спіс праблемаў кожнага дома, кожнай сям'і. Адбылося асабістае знаёмства з кожным выбаршчыкам.

У трэці раз кандыдат завітаў у кватэры з асабістай праграмай і ўжо звяртаючыся да жыхароў кандыдат называў іх імя і імя па бацьку. Пасля такой папярэдняй працы была перасцярога, што выбаршчыкі дастакова ведаюць пра свайго кандыдата і на сустрэчу не пойдуць. Тым не менш сустрэча адбылася. Яна засведчыла, што да Алеся Зарэмбюка як да канкурэнта ўлады ставяцца сур'ёзна. Аб гэтым сведчыць не толькі тое, што па гэтай выбарчай акрузе выстаўлены ў якасці кандыдата ў дэпутаты кіраўнік мясцовай дарожнай арганізацыі Іван Тарасюк, а на сустрэчу з'явіўся кіраўнік раённай выбарчай камісііі намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Гвоздзь.

Людзей, што жывуць на тэрыторыі Цэнтральнай выбарчай акругі тым часам цікавілі свае праблемы. Яны гаварылі, што ў дамах № 6, 8, 10 па вуліцы Будаўнікоў у падвалах стаіць вада ды цячэ дах. Цягнецца гэта не адзін дзесятак гадоў і нікому да гэтага няма справы. Як няма справы да лужыны, што амаль круглы год не высыхае ў двары дамоў № 2, 4 па праспекце Юнацтва і дамоў № 2, 4 па вуліцы Будаўнікоў. І каб ліквідаваць яе, трэба дзесятак машынаў пяску, аб тым гаварылі самі людзі, але для гэтага неабходна толькі праявіць ініцыятыву.

З горыччу казалі людзі, што дом № 4 па вуліцы Будаўнікоў увогуле ў аварыйным стане і можа абваліцца ў любы момант з-за трэшчыны, што ўтварылася ў выніку асадкі дома. Казалі і пра іншыя праблемы квартала, дзе жыве болей тысячы чалавек. Выказваліся не толькі патрабаванні, але і прапановы, якія вырашалі тыя ці іншыя праблемы. Уяўленне было такое, што людзям надакучыла такое жыццё і яны хочуць пераменаў. Пераменаў хаця б у малым. ■

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

# Мясцовы кандыдат Міхалевіч

**Мы працягваем апытанне кандыдатаў, якія вылучаюцца ў мясцовыя саветы.**

Алесь Міхалевіч нарадзіўся ў 1975 годзе. У 1997-м скончыў юрыдычны факультэт БДУ па спецыяльнасці паліталогія. Узначальваў Задзіночанне беларускіх студэнтаў, пасля – Маладзёвы інфармацыйны цэнтр. Старшыня Мінскай абласной арганізацыі партыі БНФ. Жанаты, дачцы два гады.

### КАНДЫДАТ У ПУХАВІЦКІ РАЁННЫ САВЕТ, ШКОЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 33

*– Мясцовыя саветы пры сённяшнім рэжыме пазбаўлены рэальных паўнамоцтваў. Што вы зможаце зрабіць у іх рамках?*

– Я згодны, што мясцовыя саветы маюць дастаткова малую ўладу. Але ў той жа час для актыўных людзей, якія хочуць працаваць і павялічваць уплыў сваёй палітычнай сілы або свой асабіста, яны з'яўляюцца рэальнай прыступкай для таго, каб зрэалізаваць свае амбіцыі. Дэпутат мае права праводзіць расследаванне, выдаваць абавязковыя для разгляду рэкамендацыі чыноўнікам, накіроўваць запыты. Яго статус дае магчымасць знаёміцца з мясцовай вертыкаллю і кіраўнікамі прадпрыемстваў. Гэта, на мой погляд, дастаткова паўнамоцтвы.

*– Якія канкрэтныя праблемы вашай акругі збіраецеся вырашыць, калі будзеце абраныя дэпутатам?*

– Хачу высадзіць сквер ад майго мікраёна і да ракі Цітаўка, якая працякае праз Мар'іну Горку. Ачысціць участак ракі каля мікрараёна, дзе я балатуюся, зрабіць там добраўпарадкаваны пляж. Таксама планую пракласці дарогу да некалькіх дамоў, да якіх немагчыма пад'ехаць. Стварыць колькі аўтастаянак, абнесеных сеткамі, каб кожны ўладальнік меў ключ і мог туды ставіць свой аўтамабіль. Ну і вырашыць дзесяткі іншых дробных праблемаў з дапамогай дэпутацкага статуса.



*– Вашыя адносіны да ўлады, як збіраецеся будаваць з ёю адносіны?*

– Да ўлады ўвогуле я, як прадстаўнік партыі БНФ, знаходжуся ў апазіцыі. Я лічу, што гэта ўлада павінна сысці. Што датычыцца ўлады на мясцовым узроўні, то мне не падабаецца практыка прызначэння вертыкальных мясцовых кіраўнікоў, абсалютна незнаёмых гэтаму раёну.

У той жа час я пазітыўна расцэньваю дзейні шэрагу мясцовых кіраўнікоў, калі гэтыя крокі скіраваныя на вырашэнне мясцовых праблемаў. Ёсць дастаткова прыязныя адносіны з шэрагам людзей з мясцовай вертыкалі. Зараз у Мар'інай Горцы знялі папярэдняга вертыкальнага за прыпіскі ў сельскай гаспадарцы. Як складуцца адносіны з новым кіраўніком, пабачым. ■

НАВСТРЕЧУ ВЫБОРАМ

# Местный кандидат Даньков

**На наши традиционные вопросы отвечает провинциальный кандидат в депутаты.**

Даньков Антон Александрович родился в Могилеве, 23 года. Окончил строительный факультет Могилевского государственного технического университета. Специальность – инженер-строитель. Работает мастером в Передвижной механизированной колонне № 268. Не женат.

### КАНДИДАТ В МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ ПО ИЗБИРАТЕЛЬНОМУ ОКРУГУ № 6

*– Многие считают, что местные советы не обладают реальной властью. Что вы сможете сделать в их рамках?*

– Может быть, один не смогу, но я надеюсь, что туда все же пройдут единомышленники, и вместе мы будем работать одной командой. Мы сможем заявить о себе. По крайней мере, будем добиваться решения вопросов от чиновников. Требовать у них отчета, что делается. Горсовет их должен тормошить, следить, как они выполняют свои обязанности. Городской совет в целом имеет определенную власть. И очень многое зависит от активной позиции каждого депутата. Сидеть и ничего не делать не имеет смысла.

*– Если станете депутатом, какие проблемы своего округа собираетесь решать?*

– Попусту я ничего не обещаю. Как некоторые обещают решить кучу мировых проблем. Люди обратятся, и мы будем по этим маленьким вопросам конкретно работать. Главным образом, буду решать, конечно, различные бытовые проблемы. Благоустройство, освещение и чистота улиц, ремонт дорог, перегруженность транспорта и перебои в его работе. Собственно, вот те проблемы, решением которых и должен заниматься горсовет. Хотелось бы еще помочь со строительством спортивных площадок в районе. Очень волнует людей и криминогенная обстановка. В частности, необходимо отрегулировать работу ночных магазинов. С одной стороны, безусловно, удобно, что в позднее время можно сделать покупки. С другой – торгуют алкоголем, и возле ночных магазинов собираются темные личности.

*– Если станете депутатом, как будете строить отношения с властью?*

– К власти я отношусь неоднозначно. У нее есть и ошибки, и дела, с которыми я на сто процентов согласен. То, с чем согласен, буду, конечно, поддерживать. Например, хорошо сделали, что облагородили центр города, ремонт провели. Но я не согласен, скажем, как организована работа предприятий. Их деятельность нужно переводить на рыночную основу и отходить от командных методов. Мало свободы дается частным предпринимателям. Не проработана законодательная база, нет четких механизмов их деятельности. Нужно давать свободу инициативе людей. Пока мы этого не видим. В последнее время обострились социальные проблемы. Произошел резкий скачок цен на коммунальные услуги, проезд в транспорте, постоянно дорожает продовольствие, ввели платные медицинские услуги. Людей к этому совершенно не подготовили и не объяснили, с чем это связано. Все проблемы нашего округа мы будем решать совместно с городскими властями. ■

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

# Павел Знавец: «*Лукашизм не вечен*»

➲ *Окончание. Начало на стр. 1*

пуган Лукашенко: даже не включили в состав избирательных комиссий представителей разных политических партий, за исключением единиц. Но это его не спасет.

*– Вы будете предпринимать попытки расширить полномочия горсовета?*

– Безусловно. Горсовет должен быть реальной законодательной властью в Минске. Нужно переходить к самоуправлению, к профессионализации этого небольшого (всего 55 депутатов) органа. То есть депутаты должны выйти с законодательным предложением в парламент о прямых выборах мэра города, а также руководителей администрации районов, которые назначаются сейчас по принципу личной преданности власти. Вот в таком направлении нужно реформировать местный совет. Сейчас он формально контролирует бюджет, голосует, принимает. А куда дальше уходят деньги, неизвестно. Наше городское хозяйство, системы теплотрасс, канализация катастрофически устаревают, требуется капитальный ремонт. Цены будут расти. Смотрите, сколько тратится на чиновников, которых расплодилось в государственных структурах больше, чем при Кебиче. Экономика лежит, реформ нет. Откуда брать деньги? С народа, с налогов, повышая коммунальные платежи.

Чтобы решать эти проблемы, для начала надо хотя бы классическое разделение властей. Чтобы была реальная законодательная власть на уровне парламента, и было местное самоуправление, и руководители районов и городов избирались жителями, которые могли бы на них влиять и переизбирать, чтобы руководители дрожали за свое кресло и дорожили выбором.

О контроле за финансами на более высоком уровне и говорить не приходится. Например, сметная стоимость новой национальной библиотеки, на строительство которой в принудительном порядке собирают с миру по нитке, по разным оценкам, от 40 до 60 миллионов. А «Славнефть» продали российским олигархам за 207 миллионов долларов. За эти деньги можно построить несколько биб-



лиотек. Но мы не знаем, куда распределились деньги. Даже с владельцев сотовых телефонов без их ведома по 5 тысяч содрали в фонд строительства библиотеки – около миллиона долларов в сумме. Может, люди и сами бы отдали, обратитесь к ним вежливо, но не так же делать. Естественно, уважения к государству, которое действует такими методами, и к его правителю никогда не будет. Не контролируются средства, мы не знаем, во что нам обходится содержание президента, его многочисленная охрана. Такого быть не должно. Мы должны знать, куда уходят наши деньги.

*– Сейчас муссируются слухи о референдуме и третьем сроке Лукашенко у власти. На ваш взгляд, как долго он продержится?*

– Даже если бы Лукашенко был наместником Бога или золотым человеком, закон есть закон. Власть развращает. Абсолютная власть развращает абсолютно. Каким бы ни был хорошим правитель, он не может более двух сроков подряд (это 8 или 10 лет максимум) занимать высшую должность в государстве. Да и, наверное, в политической партии тоже. Иначе он прирастает к креслу, отрывается от реалий, он уже не может без власти.

Недавно оставил свой пост президент Чехии Вацлав Гавел, пользующийся огромной любовью у народа. Это вообще гений в политике, для меня идеал. Многие желали бы, чтобы он и дальше оставался во главе государства. Но он бы первый выступил против, если кто-то хотя бы заикнулся о третьем сроке.

Нам нужен умный, грамотный, цивилизованный лидер. И независимый, полномочный парламент. В свое время я отказался работать в палате, назначенной Лукашенко, исключительно по принципиальным соображениям. Если бы я считал Лукашенко политиком, способным нести добро людям и объединять их, а не делить всех на своих и врагов, я бы пошел на сотрудничество с властью. Человек, который не смог даже собственный забор вокруг дома под Шкловом в порядок привести, тем более не способен управлять государством. Почти уже девять лет Лукашенко постоянно в истерике распекает, выступая, чиновников, сваливает на них всю вину, хотя вся власть в его руках, он всех их назначает. Но он не может управлять в силу своей природы. В Палате представителей я знаю многих, кто ненавидит Лукашенко. Но тем не менее они угоднически служат ему, поступаясь совестью и принципами во имя материальных благ, поездок.

*– Среди избирателей немало и верующих людей. Лукашенко лично отдает приоритет Русской православной церкви, в то время как другие конфессии всячески ущемляются в правах. Какая ваша позиция по этому вопросу?*

– Я сам верующий, венчался в 1997 году в Белорусской автокефальной православной церкви в Нью-Йорке. Но в Беларуси нет ее приходов. Я за равенство всех конфессий. И они должны быть отделены от государства, которое ко всем конфессиям должно относиться одинаково. Сейчас часть руководителей Белорусского экзархата Русской православной церкви выступили с инициативой о придании приоритета только православной церкви. Нельзя этого делать, хоть я сам православный. Нельзя в Беларуси устраивать конфронтацию еще и по признаку веры.

Не может независимое государство существовать без своей независимой церкви. Возьмите Грузию. Там апостольская православная церковь, и у них приоритет перед московским патриархатом. На Украине у православной конфессии три разных церкви: украинская автокефальная, Российский экзархат Украинской православной церкви и есть свой патриархат Украинской православной церкви. И я хочу, чтобы в Беларуси была одна своя независимая православная церковь. Чтобы в Беларуси была веротерпимость и не было гонений на религиозной основе. И всем предоставлялись равные возможности богослужения и вероисповедания любой религии.

*– Вы некоторое время работали в Америке. У вас была возможность остаться, почему вы отказались?*

– Если бы мне было лет 20, может быть, у меня были бы другие взгляды. Да и те, кто постарше, потеряв веру, что здесь можно что-то изменить, уехали. Во время сбора подписей люди говорили мне: зачем вам это надо, лукашизм – это всерьез и надолго, не тратьте свои силы и годы на борьбу с ветряными мельницами. Но ничто не вечно под луной. И я думаю, что в ближайшее время ситуация начнет меняться. Я оптимист. Белорусы за 9 лет правления Александра Григорьевича уже получили прививку от диктатуры. Узнали, что такое страх, безысходность, бессилие изменить ситуацию, сделав один раз ошибку. И я призываю руководителей разных рангов, чиновников, учителей, конкретно жителей Уручья, членов избирательных комиссий, не идти на поводу у дьявола, а послушать свою совесть: одних – прийти на выборы, а других – честно подсчитать голоса. ■

БЕЛОРУССКИЕ ВОПРОСЫ


# Все дороги...

➲ *Окончание. Начало на стр. 1*

Восточноевропейские и азиатские субконтинентальные притязания России могут выглядеть сколь угодно причудливо, особенно когда они эксплуатируют ностальгическую центростремительность постсоветского народонаселения. К примеру, недавнее объявление территорий Украины, Казахстана, Беларуси и России «*единым экономическим пространством*».

Однако ни один политический или экономический союз под эгидой России не представляет собой досужие мечтания кремлевских бюрократов. Бюрократическое естество доминирования России на постсоветском пространстве предполагает особую опасность для политической независимости Беларуси. Чтобы еще крепче привязать к российской телеге Украину и Закавказье, Среднюю Азию и Казахстан, Кремль не слишком затруднится, решаясь на аншлюс Беларуси.

Политико-административное присоединение Беларуси к России не сулит обеим странам ни малейших экономических выгод. Разве что удастся сэкономить некоторые ресурсы, ныне бездарно растрачиваемые на поддержание внешних атрибутов белорусской независимости. В качестве субъекта внутренней политики России, Беларуси не понадобятся ни дипломатические миссии, ни представительство в международных организациях. Будь то в ПАСЕ или в ПА ОБСЕ. ■



## ПОСТСАВЕЦКІЯ НАВІНЫ



**Азэрбайджан.** У адміністрацыі прэзыдэнта Аліева абвяргаюць чуткі пра раптоўнае пагаршэньне стану здароўя лідэра Азэрбайджану. Чуткі зьявіліся пасьля таго, як высьветлілася пра запляванае падарожжа Гейдара Аліева ў Злучаныя Штаты. Справа ў тым, што некалькі год таму Аліеў перанес складаную апэрацыю на сэрцы ў клініцы горада Кліўленда. Як паведаміў сродкам масавай інфармацыі загадчык аддзела зьнешніх сувязяў апарату прэзыдэнта, у Аліева няма ніякіх праблемаў са здароўем. Аднак ён не абверг чуткі пра тое, што лідэр Азэрбайджану зьбіраецца прайсьці медычнае абсьледаваньне.

**Туркменія.** Па прапанове 10 дзяржаваў-сябраў АБСЭ – Аўстрыі, Нямеччыны, ЗША, Канады, Вялікай Брытаніі, Грэцыі, Ірляндыі, Італіі, Нарвэгіі і Швэцыі – будзе створаная сьпецыяльная камісія міжнародных экспэртаў, якая павінна будзе адказаць на пытаньне, ці быў зьдзейсьнены замах на лідэра Туркменіі Сапармурата Ніязава і ці былі дапушчаныя парушэньні правоў чалавека пад час расьсьледаваньня гэтага інцыдэнту. У лістападзе мінулага году картэж лідэра Туркменіі быў абстраляны з аўтаматаў ў цэнтры Ашхабаду групай невядомых. Па абвінавачваньню ў замаху на жыцьцё Ніязава было арыштавана і асуджана больш за 50 чалавек, у тым ліку і замежнікі. Сярод асуджаных апынуліся практычна ўсе лідэры апазыцыі.

А ў самой Туркменіі чыноўнікі спаборнічаюць у тым, хто прыдумае лепшыя эпітэты дзеля ўсхваленьня генія Сапармурада Ніязава, якому найбольш даспадобы тытул туркменбашы – бацькі ўсіх туркменаў. Днямі міністар унутраных справаў Туркменіі публічна заявіў, што Алах надзяліў Ніязава рэдкім розумам, і што лідэр Туркменіі можа па праву лічыцца прарокам Алаха. Мусульмане ўсяго сьвету, аднак, перакананыя, што апошнім прарокам быў Мухамед.

**Грузія.** Рада нацыянальнай бясьпекі Грузіі вырашыла працягнуць на пэўны час мандат расейскіх міратворчых сілаў у зоне грузіна-абхазкага канфлікту. Міністар замежных справаў Грузіі Іраклі Менагарышвілі заявіў, што на гэты момант у Грузіі няма іншай альтэрнатывы, аднак Грузія сумесна зь некаторымі сяброўскімі краінамі распрацоўвае праект зьменаў складу і статусу міратворчых сілаў у бок таго, каб зьменшыць у ім колькасьць расейскіх войскаў. Між іншым, Грузія па-ранейшаму лічыць непрымальнай практыку масавай выдачы расейскіх пашпартоў жыхарам Абхазіі.

**Расея.** Як аказалася, пад час саміту лідэраў СНД у Сочы ў 2001 годзе прэзыдэнтаў вазілі па горадзе на скрадзеным аўтобусе маркі *MAN*. Як удалося высьветліць расейскім праваахоўным ворганам, аўтобус быў скрадзены ў Берасьці, а пасьля быў прададзены за 200 тысячаў даляраў праз падстаўную фірму дырэкцыі па эксплюатацыі лячэбніц міністэрства шляхоў зносінаў Расеі. Пад час саміту ў 2001 годзе ў Сочы панавала сьпякота, і адзіным даступным аўтобусам, які б адпавядаў клясу саміту, быў узгаданы *MAN*. Міліцыя праводзіць сьледзтва і ўсталёўвае вінаватых.

**Украіна.** У мінулы чацьвер адразу на дзьвюх украінскіх шахтах адбылі аварыі. У выніку аварыяў некалькі шахцёраў аказаліся адрэзанымі. Ужо вядома, што адзін зь іх загінуў – ягонае цела ратаўнікі знайшлі ў панядзелак пры разборы завалаў горнай пароды. У абодвух выпадках прычынай аварыі быў выкід газу, аднак, на шчасьце, да выбуху не дайшло. Украінскія шахты ня толькі самыя небясьпечныя ў Эўропе, але і сабекошт вуглю на іх таксама адзін з самых высокіх. Тым ня менш, усе спробы ўкраінскага ўраду рэфармаваць горназдабываючую галіну заўсёды сутыкаліся з рашучым пратэстам гарнякоў. У выніку кожны год на шахтах Украіны гіне ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх соцень гарнякоў.

